УДК902.01(476.4)

# СТРАТЫГРАФІЯ ГОРАДА БЫХАВА

Галынскі Раман Дзмітрыевіч
аспірант установы адукацыі “Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.А. Куляшова”,
галоўны спецыяліст аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Быхаўскага райвыканкама
(г. Быхаў, Беларусь)

*Артыкул прысвечаны аналізу стратыграфічных дадзеных (вертыкальная і гарызантальная), атрыманых падчас археалагічнага вывучэння горада Быхава ў 2012-2016 гг. Супастаўляюцца дадзеныя пісьмовых і археалагічных крыніц з мэтай вызначэння развіцця горада ў прасторы і яго эвалюцыі ў часе.*

Вывучэнне сярэднявечных гарадоў у значнай ступені звязана з археалогіяй. Развіццё такой катэгорыі паселішчаў добра маркіруецца разнастайнымі пажарамі, разбудовамі архітэктурных аб’ектаў і іх разбурэннямі пад час вайсковых канфліктаў і катастроф, якія паступова змяняліся. Этапы развіцця горада і яго частак дазваляе прасачыць стратыграфія. Зыходзячы са слабай археалагічный даследаванасці горада Быхава нам не выпадае падрабязна прасачыць яго развіццё ў прасторы (гарызантальная стратыграфія/планіграфія)і часе(вертыкальная стратыграфія), але пэўныя вынікі можна зрабіць грунтуючыся на матэрыялах археалагічных наглядаў і раскопак 2013–2016 гг.

Першая згадка Быхава дэманструе яго як “двор Быхово” (1391 г.) [8, с. 406]. У 1540-х гг. Станіслаў Гаштольд і Аляксандр Хадкевіч мелі сваіх асобныхураднікаў у Быхаве [2, с. 170]. Так у Быхаве магло існаваць і два асобных “двара”, а значыць і дзве ўмацаваныя сядзібы(прататыпы замкаў). Першы двор хутчэй за ўсё размяшчаўся на месцы так званага Паўднёвага гарадзішча, якое даследаваў Л.Д.Побаль, а другі – на месцы сучаснага каменнага замка з далейшай яго перабудовай. Гарадзішча з цягам часу заняпадала і выкарыстоўвалася ў якасці могілак, магчыма, для мясцовай шляхты, што атаясамляецца з культурай сарматызму XVII–XVIII стст.

Больш-менш дакладныя звесткі пра забудову і планіроўку горада адносяцца да канца XVI–XVIII стст. У гэты час горад прымаў абрысы ідэальнага горада-крэпасці, цэнтра графства і вялікай латыфундыі. З-за гэтагаБыхаўскі замак знаходзіўся ў цэнтры гарадской кампазіцыі.Веерная забудова, уласцівая старажытнарускім гарадам змянілася адпаведна агульнаеўрапейскім тэндэнцыям горадабудаўніцтва.

Найбольш прыдатныя для вывучэння напластаванні паходзяць з тэрыторыі касцёла (даследаванні 2012 і 2014 гг.), Заюраўкі – паўднёвы пасад (2013 г.), Быхаўскага замка (2013 г.), тэрыторыі кінатэатра “Радзіма” (2014 г.), Юдаўкі – габрэйскі квартал у межах абарончых умацаванняў на паўночнай частцы Быхава (2016 г.) [3-7]. Але ў іх шмат лакун з пераадкладзенымі, ці ўвогуле знішчанымі напластаваннямі. Пад час археалагічных наглядаў выкарыстоўваліся дадзеныя нумізматыкі і эпіграфікі (надпісы на кафлі і шкляных вырабах).

Матэрыялы археалагічных даследаванняў габрэйскага квартала 2016 г., паказалі, што бастыённая сістэма (каля Магілёўскай брамы) будавалася на месцы пасада, ці з падсыпкай грунта з гарадскога слоя. Слой тут моцна пераадкладзены, хутчэй за ўсё на гэтае месца трапіла мартырная бомба (падзеі Паўночнай вайны 1700-1721 гг.) і варонку пасля яе выбуху

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

засыпалі, з чым звязана перамешанасць матэрыялаў XVII ст., тады як з ніжніх напластаванняў усходняга квадрата паходзяць аднародныя матэрыялы, якія характэрны для другой паловы XVI ст. Гэтыя напластаванні на 70 сантыметраў ніжэй паднож-жа валоў і бастыёна. Значыць, умацаванні насыпалі на частцы гарадской забудовы сярэдзіны XVI ст. Гэта можа быць звязана таксама і з паступовай разбудовай і мадэрнізацыяй бастыёнаў і падыходаў да іх з боку "места".

Тут жа ў 2015 г. праводзіўся археалагічны нагляд (матэрыялы былі атрыманы з траншэі і двух калодзежаў). Асноўная частка траншэі была запоўнена будаўнічым друзам, тарфяным попелам і баластам ХХ ст. У паўночным і паўднёвым калодзежах адзначаны напластаванні з мінімальнай пашкоджанасцю ў якіх прасочаны будаўнічыя гарызонты (гліна, пясок) і культурныя напластаванні (грунт рознага колеру, прапласткі гною і вугалю). У слаях гною і вугалю знойдзены донцы гаршкоў зробленыя да апошняй чвэрці XVI ст. Гэты пажар можна звязваць з нападамі Мацюшы Федаровіча (1590 г.). Атрымана калекцыя шкляных вырабаў: пляшкі і кварты (XVII ст.) змяняюцца бытэлькамі круглага сячэння (XVIII ст.). 1660–70-я гг., па матэрыялах, характарызуюцца заняпадам вытворчасці і дэградацыі вырабаў – яны становяцца грубымі і прымітыўнымі, з вялікай колькасцю жарствы ў цесце, дрэнным абпалам, адсутнасцю паліў. К канцу XVII ст. тэхналогія вырабу гаршкоў адраджаецца. У канцы XVII – пачатку XVIII стст. з'яўляюцца гаршкі акруглабокія прысмістых форм і з прымітыўным венцам. У гэты ж перыяд з'яўляецца кафля з дывановымі арнаментамі і кафля "галандка". Такая ж сістэма датыроўкі па маркерных комплексах артэфактаў выкарыстоўвалася пры вывучэнні ўсіх калекцый з усіх частак горада. Кульурны слой месцамі (паўднёвы калодзеж) перавышае 250 см.

Побач з паўночным калодзежам у 2016 г. былі праведзены археалагічныя раскопкі. У выніку былі атрыманы больш раннія матэрыялы – другой паловы XVI ст. Сярод якіх створка крыжа-энкалпіёна, вертыкальныя падкоўкі на абцас (знікаюць у 1610–20-х гг.) і гаршкі з псеўда-рабром. Стратыграфічна напластаванні досыць аднародныя і ў асноўнай сваёй масе з'яўляюцца перакопам на месцы выбуху мартырнай бомбы ў часы Паўночнай вайны (рэшткі бомбы былі знойдзены ў ніжніх напластаваннях). Магутнасць слою вагаецца ад 120 да 140 см.

Сталае жыццё ў межах Юраўкі (пасад на паўднёвым ускрайку горада)ўсталявалася на разглядаемай частцы горада ў пачатку XVII ст. Тут стаяла сядзіба заможнага мешчаніна аб чым сведчыць комплекс артэфактаў (геральдычная кафля, вялікая колькасць шклянога посуду (адзін асобнік з кляймом)), пад час Хмяльніччыны і Трынаццацігадовай вайны пабудова была спалена. Слой пажарышча датуецца нумізматычным матэрыялам 1650-мі і 1664 гг. Жыццё паступова вяртаецца і прадаўжаецца да другой трэці XVIII ст., пасля чаго, згодна планаў перабудовы канца XVIII – пачатку XIX ст. на гэтым месцы ўтвараецца гандлёвая плошча, а ў канцы XIX ст. будуецца храм. Археалагічныя матэрыялы пазнейшыя за сярэдзіну XVIII ст. адсутнічаюць. На адным з планаў гарадской перабудовы канца XVIII – пач. XIX ст. на гэтым месцы размешчана гандлёвая плошча і дзве царквы [1]. У комплексе, нумізматычна датуемым першай паловай XVII ст., выяўлены залёнапаліваная геральдычная кафля з гербам "Ліс", з такім жа гербам шкляное кляймо ад бутэлькі.Слой дасягае глыбіні ў 120–135 см.

На правым беразе Дняпра ляжала Лявонаўская слабада [11] (сучасная Ліпецкая грыва (?)), вызваленая ад падаткаў на 14 год у 1638 г. Найбольш верагодна, што гэтая слабада была заснавана для разбудовы шкляных гут і забеспячэння іх сыравінай (пясок і драўляны вугаль). Магчыма, гэтыя гуты на ёй і знаходзіліся. На сёняшні момант Ліпецкая грыва знішчана кар'ерам па здабычы будаўнічага пяску.

Падчас вайны 1654–1667 гг., магчыма і раней, у 1648–1651 гг. пасады былі знішчаны, у тым ліку і Лявонаўская слабада. Але к канцу XVII – пач. XVIII ст. пасады аднавіліся і горад пачаў расці ў паўночным, паўднёвым і, часткова, у заходнім напрамку. Аб гэтым сведчаць археалагічныя матэрыялы і планы горада. Хаця на плане аблогі Быхава 1707/1708 гг. пасады не пазначаны. Гэта хутчэй за ўсё звязана саспецыфікай плана, яго мэтай было адлюстраваць архітэктурныя дамінанты і бастыёны для карэктыроўкі агню артылерыі.Пра развіццё астатніх сегментаў горада пакуль казаць нешта канкрэтнае не выпадае.

Самыя старажытныя фрагменты керамікі былі атрыманы на тэрыторыі касцёла. Адзінкавыя фрагменты датуюцца XV–XVI стст. – гаршкі з выразным стромкім рабром па плечуку і псеўдакарнізікам па венцы. Прысутнічаюцьлінзы будаўнічага друзу, утворанага пасля расчысткі пажара сярэдзіны XVII ст. – шмат паліванай двухпрыступковай перапаленай кафлі, цэлыя экзэмпляры маюць дату – 1646 г. Слой перавышае 200 см.

Матэрыялы з кінатэатра "Радзіма" паказалі, што гэтая тэрыторыя была адведзена пад палеткі. Былі зафіксаваны фрагменты керамічнага начыння канца XVIII – XIX ст. Магутнасць слою – да 45 см.

Быхаў, як і ўся Усходняя Беларусь апынуўся ў складзе Расійскай Імперыі ў 1772 г. Гэта прывяло к пэўным зменам у планіроўцы горада, але не такія маштабныя, як планавалі новыя ўлады. Было складзена шмат варыянтаў перапланіроўкі горада, паводле аднаго з такіх планаў гістарычную частку горада прапанавалася прывесці да веернай сістэмы вуліц, якія сыходзіліся да замка, і арганізацыі пры ім прамавугольнай плошчы-«плацдарма» [10, с. 68, 70].

Такім чынам як і ва ўсіх гарадах стратыграфія культурных напластаванняў горада Быхава змяняецца ў залежнасці ад месца і ўмоў іх утварэння і існавання (інтэнсіўнасці жыцця і дзейнасці насельніцтва на працягу ўсяго існавання горада). У гістарычных частках горада культурны слой дасягае магутнасці да 2,5 метраў, а ў некаторых масцах і да 4,5 метраў (па дадзеных І.І. Сінчука, да справаздач якога адсутнічае доступ) [9, с. 134].

З прааналізаваных матэрыялаў вынікае, што асноўныя стратыграфічныя матэрыялы дытуюцца прамежкам XVI–XVIII стст. Адметнай рысай быхаўскіх гарадскіх напластаванняў з'яўляецца маркіроўка пажарышчамі. Асноўныя пажары звязаны з вайсковымі канфліктамі, якія ўплывалі і на гарызантальную стратыграфію, да іх адносяцца наезды казакоў (1590 і 1595 гг.), Хмяльніччына (1648-1651 гг.), Трынаццацігадовая (1654-1667 гг.), Хатняя (1696-1702 гг.) і Паўночная (1700-1721 гг.) войны. Дакладна адзначаная максімальная інтэнсіўнасць напластаванняў дасягае 250 см.

**Спіс выкарыстанай літаратуры**


1. Боровой, Р. Памятник архитектуры XVII в. – б. синагога в Быхове. Комплексные научные изыскания историко-библиографические исследования 02.02. КНИ / Р. Боровой, В. Первышин. – Минск, 1991 г.
2. Волкаў, М.А. Быхаў у першай палове XVII ст. / М.А. Волкаў // Сапегі: асобы, кар'еры, маёнткі : зборнік навуковых артыкулаў. – Мінск. 2013. – С. 167–194.
3. Галынскі, Р.Дз. Справаздача аб археалагічным наглядзе на аб'екце "Строительство сетей теплоснабжения к зданию прихода храма Святой Живоначальной Троицы г. Быхова" ў 2013 г. (Дамова Інстытута Гісторыі НАН Беларусі з настаяцелем храма Святой Жыванача льнай Тройцы г. Быхава ад 26 снежня 2013 г.) / Р. Дз. Галынскі. – Магілёў, 2014.
4. Галынскі, Р.Дз. Справаздача аб археалагічным наглядзе на аб'екце "Текущий ремонт водопроводной сети по адресу г.Быхов, ул. Советская, 2" ў г. Быхаве Магілёўскай вобласці (Дамова Інстытута Гісторыі НАН Беларусі з Быхаўскім раённым спажывецкім таварыствам г. Быхава ад 19 чэрвеня 2015 г.). / Р. Дз. Галынскі. – Магілёў, 2016.
5. Галынскі, Р.Дз. Справаздача аб археалагічных разведках 2012 г. / Р.Дз. Галынскі. – Магілёў, 2013.
6. Галынскі, Р.Дз. Справаздача аб археалагічных разведках і раскопках у гістарычным цэнтры г. Быхава Магілёўскай вобласці ў 2013 г. / Р.Дз. Галынскі. – Магілёў, 2014.
7. Марзалюк, І.А. Отчёт об археологических разведках на территории Быховского замка в 2013 г. / І. А. Марзалюк. – Могилев, 2014 (рукопись).
8. Описание бумаг и документов, хранящихся в Московском архиве Министерства Юстиции. – Москва (без даты). – Кн. 21. – С. 406
9. Сінчук І.І. Быхаў / І.І. Сінчук // Археалогія Беларусі: Энцыклапедыя: у 2 т. Т. А-К / рэдкал.: Т.У. Бялова (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2009. – 496 с.: іл. – С. 134.
10. Слюнькова, И.Н. Архитектура городов Верхнего Приднепровья XVII – середины XIX в. / И.Н. Слюнькова. – Мн. : Навука і тэхніка, 1992. – 144 с. : ил.
11. Шкапляроў Ю.П. Ідэальны горад-крэпасць. Ваенная гісторыя Старога Быхава ў XVII стагоддзі : манаграфія / Ю.П. Шкапляроў, М.А. Волкаў, Р.Д. Галынскі : пад навук. рэд. доктара гістарычных навук, прафесара І.А. Марзалюка : М-ва ўнутр. спраў Рэсп. Беларусь, установа адукацыі "Магілёўскі інстытут Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь". – Магілёў : Магілёўскі інстытут МУС, 2018. – 140 с.




Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова